# УСПАМІН ПРА МЕСЯЧНАЕ ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ Ў БРЭСЦКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ А. С. ПУШКІНА

У чарговы раз даводзіцца пісаць пра чалавека не з нагоды юбілею, а з нагоды смерці. Заўчасна сышоў з жыцця Сяргей Паўлавіч Кубека. Наша знаёмства спачатку адбылося завочна.

У пачатку 2000-х я пачаў працаваць над доктарскай дысертацыяй па гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Адным з накірункаў майго даследавання было вывучэнне працэсу фарміравання крыніцавай базы. Важнай першакрыніцай для вывучэнне гісторыі часова акупаванай тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца "Александрыйскія мікрафільмы" – мікрафільмы з Патсдамскай калекцыі. Пра наяўнасць у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь дадзенай калекцыі я ўпершыню даведаўся з публікацый вядомага спецыяліста па нямецкіх крыніцах Сяргея Яўгенавіча Новікава.

Аднак праз непрацяглы час у якасці распрацоўшчыка дадзенай стужкі стаў згадвацца С. П. Кубека. Так я праз публікацыі даведаўся пра яшчэ аднаго даследчыка "Александрыйскіх мікрафільмаў". Асабістае знаёмства адбылося на адной з канферэнцый "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", якая, дарэчы, стала візітнай карткай Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і кафедры, якую больш за 20 гадоў узначальвае С. Я. Новікаў. Першае, што кінулася ў вочы, – гэта чалавечнасць і спакой. Гэтыя якасці асабліва яскрава праявіліся ў снежні 2018 г., калі Сяргей Паўлавіч прыехаў да нас на стажыроўку, якая істотна адрознівалася ад усіх ранейшых форм павышэння кваліфікацыі, што адбываліся на базе нашага ўніверсітэта. Да гэтага часу аб стажыроўцы дамаўляліся загадчыкі кафедраў, якія атрымлівалі дазвол на яе арганізацыю і правядзенне ад свайго кіраўніцтва. Рыхтаваўся план, а ў канцы стажор трымаў справаздачу на дзвюх кафедрах. Больш ніякіх папер не патрабавалася. Складанасць дадзенай сітуацыі заключалася ў тым, што стажыроўка была арганізавана Міністэрствам адукацыі, пад яе былі выдзелены сродкі, а пасля заканчэння стажыроўкі неабходна было выдаць адпаведны сертыфікат. Аднак Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна не меў права выдаваць такі дакумент. І наогул, мы не былі падрыхтаваны да такой стажыроўкі. Да таго ж дакументы, з якімі прыехаў С. П. Кубека, не адпавядалі патрабаванням. Сказаць, што ва ўсіх быў шок, не сказаць нічога. Аднак, Сяргей Паўлавіч быў спакойны і ўпэўнены, што ўсё закончыцца добра. Як не дзіўна, але ўсё так і атрымалася. Зараз я разумею, што дабрыня і спакой Сяргея Паўлавіча, акрамя асабістых якасцей, у значнай ступені падтрымліваліся і яго сябрамі, у першую чаргу Сяргеем Яўгенавічам Новікавым, з якім С. Я. Кубеку звязвалі дзесяцігоддзі сяброўства, якое пачалося яшчэ ў педагагічным інстытуце.

*У. В. Здановіч,*
*доктар гістарычных навук*